Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

№ 23 (878) Чэрвень, 1965 г.

Год выдання 10-ы

Цана 2 кап.

Выступае ансамбль скрыпачоў Гродзенскага музычнага вучылішча. Яго канцэрты заўсёды з задавальненнем слухаюць жыхары горада над Нёманам.

Фота **Д. Прэса.**

А. БЯЛЕВІЧ,

пісьменнік

Сцежкамі Прынямоння

МНОГА прайшоў, праехаў я пад небам роднага краю. Ні ў раманах, ні ў паэмах, ні ў гучных, задушэўных песнях нельга поўнасцю выказаць замілаванасць да нашых працавітых людзей. Таму абмяжуюся толькі родным маім раёнам над Нёманам, спынюся толькі на асобных малюнках, эпізодах з жыцця землякоў Уздзеншчыны...

Прыйшло ў поле лета. Вясёлка піла ваду ў светлым Нёмане. Яна піла, а нада мною ў промнях сонца — дожджык залаты. Хараство! Зярністаю, мажною стала ніва. Угрэтая, духмяная. Нібыта ад хлебнай дзяжы, ад нівы пах ішоў цёплы, густы, і ў гэты прыемны, моцны дух уліваўся яшчэ намоклага сена настой, водар канапель, духмян жывіцы, свежасць таго сасоннику, што над Нёманам...

Хараство!

Ішоў я лугамі, бярэзнікамі, дубровамі ды смалістымі берагамі, праз якія бяжыць Нёман. Тут, каля прыгожай зялёнай вёскі Калінінск, Нёман зусім вузенькі, тут ён пачынаецца, выцякае з-пад ракітавых кустоў. Ручаіны, крыніцы булькочуць, уліваюцца, напаўняюць вузеньку рачулку. А яна бяжыць, п'е тыя чыстыя крыніцы, бяжыць да Пясочнага, да Мікалаеўшчыны, дзе нарадзіўся пясняр нашага краю Якуб Колас. У дні сваёй паэтычнай маладосці ён пісаў:

Льецца Нёман паміж гораў,
Светлы, чысты, як з расы.
Накапаў ён ям і мораў,
Гоніць воды праз лясы...

Якуб Колас, яшчэ будучы юнаком, пратоптваў сцежкі да гэтай светлай ракі. Карміла і паіла яна многіх вяскоўцаў у тыя далёкія галодныя гады. Несла яна доўгія згоны плытоў за межы Беларусі, несла бярозу, сасну, дубы ды вязы ў чужыя краіны. Радзелі, вынішчаліся нашы гаі і дубровы.

Гляджу і гляджу з-пад рукі,
Як моладасць нашу
вывозяць...

А што ж было рабіць? Трэба ж было неяк агораць капейку, пракарміцца неяк трэба было. Многа слёз горкіх, поту салёнага занёс Нёман у Балтыйскае мора.

Перавярнуў адвечныя дзірваны і межы, на новы лад перабудаваў наша жыццё Кастрычнік. Абнавілася, пахарашэла і мая дарагая Уздзеншчына. І плывуць над Нёманам новыя песні, мілагучныя зажынкі і дажынкі, сардэчныя калыханкі, вянкі новай долі плывуць па Нёмане.

Цёпла, хораша на сэрцы.

І вядзе, і вядзе мяне сцежачка берагам Нёмана. Даспелая ніва звініць каласамі за ракою. Уплятаюць у тое хараство маторы свае звонкія галасы. Шырока, далёка коціцца песня працы. А яе на крылы бяруць, у небе гушкаюць птушкі, нясуць яны шматгалосую песню ў лугі, у бярэзнікі, у сасняк, што сінее над ракою. А ўжо сонца коціцца за той сіні лес. Я праз песні іду на той агеньчык, што на ўзлессі гарыць. Можа, начлежнікі развялі? Бліжэй падыходжу. Малыя хлапчукі, дзяўчаткі, а між іх стары сядзіць. Вусаты, бародка падстрыжана. Гэ, пазнаю! Гэта ж зенькаўскі пчаляр, паважаны Ліпай між дзяцей. Гэта ён на піянерскі касцёр прыйшоў. Расказвае дзецям, як Зімні браў, як Леніна бачыў. Цікава паслухаць старога...

— А ў Чурылаве быў? — пытаецца ён.

— Быў.

— Ага, быў. Добра. А як там?

— Не горш, як у вас.

— Правільна, — згаджаецца пчаляр. — Не горш. Добра. А ты ў жывую гісторыю ўлезь. Улазіў? Ага, не ўлазіў.

Я не перапыняю пчаляра, хоць добра ведаю гісторыю Чурылава. Гэта была заімшэлая ў сваёй цемры вёска. Бывала, калі ўбачаць чалавека ў лазовых лапцях, у смузе ды ў журбе, дык пальцам на яго пакажуць:

— Глянь, вунь чурылавец пайшоў.

Так было. А цяпер? А цяпер культурай славіцца Чурылава. Многа аграномаў, інжынераў, настаўнікаў, урачоў з таго Чурылава. З гэтай жа вёскі і старэйшы наш дзіцячы пісьменнік Алесь Якімовіч.

Усход сонейка зноў страчаю над Нёманам. А над ім плыве, кучаравіцца густы туман, нібыта тыя ружаватыя промні падпалілі раку, узнялі белы дым над берагамі. А калі ўзлезці на тую грушу-дзічку, якая стаіць у жыце дык можна ўбачыць вёску Вусу. А чаго на яе глядзець? А я вам скажу: там добры дружбак мой госціць у брата — Пятро Фёдаравіч Глебка, акадэмік. Але ж і гэта не ўсё. Пятро Фёдаравіч — старэйшы наш паэт. У тым салаўіным кутку, над рэчкай Вусай, нарадзіўся, узрос Пятро Глебка.

А калі з той жа дзічкі-грушы зірнуць налева за Нёман, за рачулку Неманец, дык можна ўбачыць вёску Прысынак. Там дзяўчаты-красуні, а ў тых дзяўчат салаўіныя галасы. На ўсю рэспубліку празвінеў іх хор. І вырас там свой самадзейны кампазітар і паэт Шыдлоўскі. Сам піша тэксты і музыку для свайго калгаснага хору. Тут вырас і напісаў свае першыя п'есы малады драматург Алесь Махнач. У гэтых ваколіцах нарадзіліся,

(Заканчэнне на 5-й стар.)

• падзеі • людзі • факты •

ЦИФРЫ РОСТА

Для советских людей уже стало привычным, что все планы, намечаемые на определенный этап коммунистического строительства, не только выполняются в срок, но и перевыполняются. Это, прежде всего, результат энтузиазма советского народа, результат планового ведения нашего хозяйства, что создает наилучшие условия для развития производства самыми рациональными путями, для достижения высокой производительности общественного труда. Об этом красноречиво говорят цифры выполнения государственного плана промышленностью СССР в первом квартале 1965 года.

Вот некоторые из них, наиболее характерные.

Прирост промышленной продукции, например, по сравнению с соответствующим периодом 1964 года составил 9 процентов. Что касается отдельных отраслей промышленности, то их продукция выросла: электроэнергия — на 10 процентов, химия — на 14, машиностроение — на 7, легкая и пищевая промышленность — на 10, производство предметов культурно-бытового назначения — на 10 процентов. Или другими словами, в первом квартале текущего года произведено больше, чем за это же время в 1964 году, электроэнергии на 10 миллиардов киловатт-часов, нефти — на 4 миллиона тонн, хлопчатобумажных и шелковых тканей — на 28 миллионов квадратных метров, мяса — на 115 тысяч тонн, цельномолочной продукции—на 545 тысяч тонн и т. д.

Согласно данным ЦСУ при Совете Министров БССР, досрочно выполнила план первого квартала 1965 года и промышленность нашей республики как по общему объему производства, так и по выпуску важнейших видов продукции. В сравнении с тем же периодом прошлого года прирост промышленной продукции белорусских заводов и фабрик составил 10 процентов. Резко возрос выпуск продукции. В частности, производство электроэнергии увеличилось на 22 процента, выпуск продукции химической промышленности — на 25, легкой и пищевой — на 7 процентов. В республике произведено больше, чем в первом квартале 1964 года: электроэнергии — на 405 миллионов киловатт-часов, минеральных удобрений — на 256 тысяч тонн, тракторов — на 1 983 штуки, бумаги — на 965 тонн, кожаной обуви — на 257 тысяч пар, тканей всех видов — на 681 тысячу квадратных метров. Намного больше произведено мяса, цельномолочной продукции и животного масла.

На 4 процента возросла и производительность труда в нашей промышленности. А это значит, что план второго квартала текущего года также будет выполнен досрочно.

МАСКВА

У Савецкім Саюзе адбыўся запуск штучнага спадарожніка Зямлі «Космас-67». На борце спадарожніка ўстаноўлена навуковая апаратура, прызначаная для далейшых даследаванняў касмічнай прасторы ў адпаведнасці з праграмай, аб'яўленай ТАСС 16 сакавіка 1962 года.

МІНСК

65 тысяч сем'яў мінчан адсвяткавалі за апошнія шэсць год наваселле ў добраўпарадкаваных кватэрах. За гэты час удвая расшырылася ў горадзе сетка прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання.

МАСКВА

Народная оперная студыя Мінскага палаца культуры прафсаюзаў паказала ў Крамлёўскім тэатры сваю лепшую работу — пастаноўку оперы Вердзі «Травіята». Партыю Віялеты выконвала таваразнаўца Д. Угоднікава.

БРЭСТ

Цэх буйнапанельнага домабудавання ўступіў у строй на Брэсцкім заводзе жалезабетонных вырабаў. Пачаўся выпуск дэталей для 90-кватэрнага дома. Цэх аснашчан сучасным высокапрадукцыйным абсталяваннем. Усе працэсы вырабу дэталей механізаваны, а некаторыя — аўтаматызаваны. Змацірованы дзве паточныя лініі, на якіх панелі падрыхтоўваюцца, тынкуюцца, грунтуюцца і афарбоўваюцца. Тут жа ўстаўляюць дзверы і аконныя рамы. Гэта дазваляе адпраўляць на будаўнічую пляцоўку дэталі ў гатовым выглядзе.

Магутнасць цэха разлічана на выпуск 12—13 дзевяностакватэрных дамоў у год.

МАГІЛЁЎ

Калектывы харчовых прадпрыемстваў вобласці дзейсна рыхтуюцца да перапрацоўкі гародніны і садавіны новага ўраджаю. Будуюцца новыя і расшыраюцца дзеючыя цэхі. Буйны механізаваны кансервавы цэх узведзен на Чэрыкаўскім сушыльным заводзе. Ён аснашчан найноўшай тэхнікай. Магутнасць цэха — мільён умоўных бляшанак у год. Такі ж цэх будуецца на Асіповіцкім харчкамбінаце.

СЛОНІМ

Тут ідзе будаўніцтва матораремонтнага завода. Будаўнікі заканчваюць кладку сцен другога паверха адміністрацыйна-бытавога корпуса, а крыху ў баку ўзвышаецца будынак кацельнай. Распачат мантаж каркаса галоўнага корпуса.

Матораремонтны завод уступіць у строй у пачатку 1967 года. Тут будзе штогод рамантавацца да 10 тысяч рухавікоў трактараў і камбайнаў.

СВЕТЛАГОРСК

У комплексе вялікай будоўлі на Бярэзіне прадугледжана ўзвядзенне магутнасцей па вытворчасці серавугляроду, які пакуль што дастаўляецца сюды з іншых прадпрыемстваў краіны. Будаўніцтва гэтага прадпрыемства пачалося. Яно забяспечыць патрэбу ў серавугляродзе Светлагорскага і Магілёўскага заводаў штучнага валакна. Увядзенне прадпрыемства ў эксплуатацыю намечана на 1967 год паступова дзвюма чэргамі.

КЛІМАВІЧЫ

На камбінаце будаўнічых матэрыялаў будуецца цэх па выпуску мела-тарфяных угнаенняў для патрэб сельскай гаспадаркі рэспублікі. Магутнасць яго — 100 тысяч тон прадукцыі ў год.

БЫХАЎ

Паспяхова здалі экзамены па вытворчаму навучанню адзінаццацікласнікі Чырвонабеларускай сярэдняй школы.

Больш ста вучняў добра асвоілі вытворчыя спецыяльнасці, а тым, хто атрымаў на экзамене выдатныя адзнакі, прысвоен другі разрад токара або трактарыста. Многія навучэнцы выказалі жаданне працаваць па гэтых спецыяльнасцях.

ЛІДА

Завод электравырабаў рыхтуецца да ўдзелу ва Усесаюзным гандлёвым кірмашы, які адкрываецца ў чэрвені ў Маскве. На ім будуць дэманстравацца 50 розных экспанатаў — настольныя лямпы, бра, таршэры і інш. Пры аддзелцы іх шырока выкарыстоўваюцца арганічнае шкло з пластыкам і іншыя сінтэтычныя матэрыялы.

АСІПОВІЧЫ

Шмат працаўнікоў раёна, якія займаліся ў вячэрніх школах, здалі апошні экзамен на атэстат сталасці. Напрыклад, толькі ў калгасах «Бальшавік» і «Чырвоны ўдарнік» сёлета атэстаты сталасці атрымалі 30 чалавек.

Сабраць па 150 цэнтнераў бульбы з гектара — такую задачу паставілі члены сельгасарцелі «Піянер» Капыльскага раёна. Пасадка вядзецца толькі гатункавымі клубнямі па добра ўгноенай глебе. На сяўбе вялікую дапамогу аказвае калгасу раённае аб'яднанне «Белсельгастэхніка». НА ЗДЫМКУ: пасадка бульбы ў 2-й паляводчай брыгадзе. На пярэднім плане: аграном Валянцін Войтаў (справа) і ўпраўляючы Капыльскім аб'яднаннем «Белсельгастэхніка» Міхаіл Карначоў правяраюць якасць пасадкі.

Фота П. Наватарава.

У Мінскай школе кулінарнага вучнёўства адбыўся чарговы выпуск. Больш 150 навучэнцаў атрымалі дыпломы павароў, кандытараў і афіцыянтаў. У палацы культуры прафсаюзаў праведзен вечар-злёт выпускнікоў школы. На вечары была праведзена выстаўка-продаж кулінарных і кандытарскіх вырабаў навучэнцаў школы.

У Оршы заканчваецца будаўніцтва другой чаргі млынкамбіната. З уводам яе ў дзеянне магутнасць прадпрыемства павялічыцца амаль удвая. Калгасы і саўгасы рэспублікі атрымаюць значна больш камбінаваных кармоў.

Фота Г. Усламава.

КАПЕНГАГЕН. Кароль Даніі Фрэдэрык IX уручыў акадэміку П. Капіцы залаты медаль імя Нільса Бора. Медаль прысуджан савецкаму вучонаму Дацкім інжынерным таварыствам за выдатныя дасягненні ў галіне выкарыстання атамнай энергіі ў мірных мэтах.

АНКАРА. Пасля заканчэння афіцыяльнага візіту ў Турцыю міністра замежных спраў СССР А. Грамыкі апублікавана сумеснае савецка-турэцкае камюніке.

Абодва бакі заявілі аб сваім імкненні рабіць усё, што ад іх залежыць, каб у адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі Статута ААН садзейнічаць, сумесна з іншымі дзяржавамі, змяншэнню міжнароднай напружанасці, паляпшэнню адносін паміж дзяржавамі, забеспячэнню мірнага суіснавання дзяржаў з розным сацыяльным ладам. Міністры замежных спраў выказалі ўпэўненасць у тым, што права народаў жыць без усялякага каланіяльнага прыгнёту з'яўляецца адной з асноўных умоў забеспячэння трывалага міру.

ХАНОЙ. В'етнамская сталіца праводзіла 1 000 юнакоў і дзяўчат—членаў Саюза працоўнай моладзі, якія выказалі жаданне паехаць у горныя раёны краіны. Задача моладзі—вывесці горныя раёны са стану адсталасці, дабіцца рэзкага паскарэння іх эканамічнага і культурнага развіцця. Ужо 20 тысяч маладых жыхароў сталіцы ўдзельнічаюць у выкананні гэтай ганаровай задачы.

ГАВАНА. На паўднёвай ускраіне кубінскай сталіцы ўзнік цэлы гарадок новых заводскіх карпусоў. Гэта камбінат рамонтных прадпрыемстваў міністэрства сувязі рэспублікі. У будаўніцтве раду прадпрыемстваў камбіната вялікую дапамогу аказаў Савецкі Саюз. У СССР былі падрыхтаваны таксама кваліфікаваныя кадры кубінскіх рабочых.

ЛОНДАН. Англійскі ўрад прыняў рашэнне аб пераходзе на дзесяцічную сістэму мер і вагі. Урад намерваецца праводзіць рэформу паступова, на працягу 10—20 год.

ХАРТУМ. Суданскі ўрад будзе дапамагаць народу Конга да таго часу, пакуль гэта суседняя краіна не здабудзе поўную свабоду, гаворыцца ў апублікаванай тут афіцыяльнай заяве прэм'ер-міністра Судана Хатэма эль-Халіфы.

ЗАНЗІБАР. Уся зямля на Занзібары і Пембе будзе перададзена сялянам, заявіў першы віцэ-прэзідэнт Аб'яднанай Рэспублікі Танзаніі Абейд Каруме, выступаючы на мітынгу ў дзяржаўна-эксперыментальнай гаспадарцы ў Кізімбані. У пачатку чэрвеня 900 фермераў атрымаюць па 1,2 гектара зямлі. У далейшым кожны месяц дзве тысячы фермераў будуць атрымліваць участкі, да таго часу пакуль усе сяляне Занзібара і Пембы не будуць надзелены зямлёй.

ПРАЦАЎНІКАМ СЯЛА

Новы гастраном здадзен у эксплуатацыю ў Паставах. Ён аснашчан сучасным хладзільным і іншым абсталяваннем.

У Гарадку пабудаван двухпавярховы універмаг. Такі ж універмаг будуецца ў Бешанковічах. У Браславе адкрыта кафэ, якое мае вялікі поспех у наведвальнікаў. Рэстараны-кафэ хутка адкрыюцца ў Глыбокім і Сянно.

Толькі сёлета ў калгасах, саўгасах і раённых цэнтрах вобласці спажывецкая кааперацыя будзе 75 розных гандлёвых прадпрыемстваў і каля 20 прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

УСЁ ЛЕПШАЕ — ДЗЕЦЯМ

1 га чэрвеня свет у шаснаццаты раз адзначае Міжнародны дзень абароны дзяцей. Гэты дзень стаў традыцыйным аглядам рашучасці людзей добрай волі змагацца і абараніць шчасце сваіх дзяцей.

У нашай краіне дзеці абкружаны ўвагай і клопатамі. Гэта адзіны «прывілеяваны клас» у СССР. Дзіця яшчэ не нарадзілася, а за яго здароўем ужо ўважліва сочаць медыцынскія работнікі. Затым дзіцячыя яслі, сад, школа. І ўсё гэта бясплатна або амаль бясплатна. Лепшыя будынкі — дзецям, лепшыя санаторыі — дзецям, лепшыя паркі — дзецям. Ім аддае свае сілы і веды цэлая армія ўрачоў, настаўнікаў, трэнераў, артыстаў. У Савецкім Саюзе клопат не толькі аб тым, каб накарміць і апрануць маленькага грамадзяніна, але і аб тым, каб вырасціць сапраўднага чалавека — адукаванага, моцнага фізічна, здольнага разумець і ствараць у жыцці прыгожае. І гэты клопат у асноўным бярэ на сябе дзяржава.

Дваццаць год прайшло з таго часу, як скончылася другая сусветная вайна, але мільёны дзяцей на планеце працягваюць гінуць ад пастаяннага недаядання, эпідэмій, знясільваючай працы. У 9-й Дэкларацыі, прынятай у 1959 годзе ААН, запісана: «Дзеці, якія не дасягнулі належнага ўзроставага мінімуму, не павінны прымацца на работу. Ім ні ў якім разе нельга даручаць або дазваляць работы або занятак, якія былі б шкодны для іх здароўя або адукацыі ці перашкаджалі іх фізічнаму, разумоваму і духоўнаму развіццю». Але ў многіх капіталістычных краінах дзеці да гэтага часу працуюць у цяжкіх антысанітарных умовах. Палавіна дзяцей зямнога шару не наведвае школы.

Вялізарныя сумы грошай, за якія можна б было карміць, лячыць, апранаць і вучыць усіх хлопчыкаў і дзяўчынак планеты, на жаль, усё яшчэ ідуць на стварэнне зброі. Пакуль існуе пагроза новай вайны, пакуль рвуцца бомбы ў В'етнаме і льецца кроў у Конга, маці пяці кантынентаў не могуць быць спакойныя за будучыню сваіх дзяцей.

Зразумела, дзеці не здольны абараніць сябе ад смертаноснага агню вайны. Так, гэта павінны зрабіць за іх дарослыя — бацькі, маці, усе сумленныя людзі на зямлі. У Дзень абароны дзяцей яны цвёрда заяўляюць аб сваёй рашучасці адстаяць для іх мір і шчасце.

— Добра спалася? — пытаецца ўрач дзіцячага сада Мінскага скурзавода «Бальшавік».

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ — НАВАСЁЛ

Магілёў... З глыбіні стагоддзяў вядзе ён сваю гісторыю. Праз два гады магіляўчане будуць адзначаць 700-годдзе горада. І нягледзячы на свае сем стагоддзяў, ён з кожным годам расце, прыгажэе і маладзее.

Асабліва вялікія змены адбыліся ў Магілёве за апошняе дзесяцігоддзе. Ён стаў горадам вялікай хіміі, буйнога машынабудавання і металургіі. Вось яскравая лічба, якая паказвае эканамічны росквіт горада. У гэтым годзе аб'ём прадукцыі прадпрыемстваў Магілёва ў пяць разоў перавысіць даваенны ўзровень і ў 850 разоў — паказчыкі 1913 года.

Ва ўсе эканамічныя раёны нашай краіны ідуць магілёўскія маставыя краны і скрэперы, чыгунныя трубы і электрарухавікі, вісказны шоўк і цэлафан, абутак і трыкатаж. Больш 30 краін свету атрымліваюць прадукцыю з маркай магілёўскіх заводаў і фабрык.

Скрэперы завода пад'ёмна-транспартнага абсталявання імя Кірава вядомы ў Каракумах і Салігорску, на Брацкай ГЭС і ў Крыме. Металургічны завод імя Мяснікова нельга параўноўваць, зразумела, з вядомымі ў краіне металургічнымі гігантамі. Але малы залатнік, ды дарагі. Аб магілёўскіх металургах гавораць цяпер ва ўсёй краіне. Заводскія наватары — галоўны інжынер Рыгор Архіпаў, начальнік цэха Мікалай Ціхаміраў і іх таварышы па рабоце — былі першымі ў краіне, хто прапанаваў і асвоіў паўняспынны спосаб адліўкі чыгунных труб. А цяпер магілёўскія металургі асвойваюць выпуск труб няспынным спосабам вытворчасці.

На ўсесаюзных ярмарках і выстаўках добра зарэкамендавалі сябе вырабы швейнай фабрыкі імя Валадарскага, трыкатажнай, мэблевай, абутковай фабрык, скуранога і ложкавага заводаў.

Радуюць сваімі падарункамі магіляўчан і будаўнікі. Кожны ўзведзены імі жылы дом прыносіць радасць дзесяткам сем'яў. А такіх сем'яў робіцца ўсё больш і больш. У апошнія гады вінпаванні з наваселлем прымаюць штодзённа 6—7 сем'яў. А ўсяго за апошнія пяць год навасёлам стаў кожны чацвёрты жыхар горада.

Цяпер жыллёвае будаўніцтва сканцэнтравана ў асноўным у мікрараёне «Мір». Гэта — горад у горадзе. У аснову праекта новага мікрараёна, распрацаванага групай магілёўскіх архітэктараў пад кіраўніцтвам Ігара Фралова, пакладзен прынцып свабоднай планіроўкі. Ён дазваляе максімальна выкарыстаць існуючы рэльеф мясцовасці, зрабіць больш танным будаўніцтва і ў той жа час стварае максімум зручнасцей для жыхароў.

Тут планіроўшчыкі прадугледзелі будаўніцтва дамоў некалькімі групамі. Кожная з іх мае дзіцячы сад і яслі, прадуктовы магазін, дамовую кухню, прадпрыемствы бытавога абслугоўвання, адным словам усё, што патрабуецца чалавеку штодзённа. На некалькі груп жылых дамоў будуецца школа, клуб, бібліятэка, паліклініка, аптэка, кафэ-сталоўка і г. д.

Вялікія змены адбываюцца і ў культурным жыцці магіляўчан, у галіне народнай асветы і аховы здароўя. Уступіў у строй кінатэатр на 800 месц. Заканчваецца будаўніцтва новага памяшкання абласной бібліятэкі на 500 тысяч тамоў. Новы будынак расце на бульвары Леніна. Ён будзе працягам асноўнага корпуса машынабудаўнічага інстытута. Студэнты атрымаюць сваю спартыўную залу, а таксама новыя аўдыторыі і лабараторыі.

Старажытны горад на Дняпры — у вялікім творчым паходзе.

В. АЛЯКСЕЕЎ.

ШКОЛЬНЫ МУЗЕЙ

Любоў да роднага краю, да сваёй зямлі адчуваецца ў кожным экспанаце музея Верхнядзвінскай школы № 2, што на Віцебшчыне. У ім сабраны адзіныя ў свеце дакументы, якія расказваюць аб Асвейскай трагедыі. У час Вялікай Айчыннай вайны Асвея і прылягаючыя да яе 150 вёсак былі знішчаны фашысцкімі карнікамі. Гэта адна са страшэнных трагедый нашага народа. За некалькі дзён тут было забіта фашыстамі больш 20 тысяч чалавек.

Савет музея і яго актыў не абмяжоўваюцца толькі зборам экспанатаў. У Маскве піянеры адшукалі аднаго з першых камсамольцаў Асвейшчыны Ганько. Цяпер у музеі захоўваецца яго білет. Тут жа сабраны унікальныя экспанаты, прысланыя Вільгельмам Пікам: яго перапіска з Ул. І. Леніным, Марысам Тарэзам, Даларэс Ібаруры, Антанінам Новатным, Вілі Песі, асабістая анкета Ул. І. Леніна, як дэлегата X Усерасійскага з'езду, першы нумар беларускай рэспубліканскай газеты «Звязда», выдадзены на акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі і іншыя унікальныя экспанаты.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на Верхнядзвіншчыне змагаліся партызаны трох рэспублік, сярод якіх быў нацыянальны герой латышскага народа Судмаліс. Яго апошняе пісьмо жонцы і дзецям таксама захоўваецца ў музеі. Тут знаходзяцца ўзнагароды і ўласныя рэчы загінуўшых народных мсціўцаў, якія дзейнічалі ў Прошкаўскай падпольнай арганізацыі.

І. ГУСЬКОЎ.

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

Сегодня в номере

ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ ЧИТАЕТ ПО-БЕЛОРУССКИ

Номер открывается статьей белорусского поэта Антона Белевича **«СЦЕЖКАМІ ПРЫНЯМОННЯ»**, в которой он рассказывает о талантливых людях своего родного Узденского района. Именно здесь началась поэтическая молодость Якуба Коласа, в этих наднеманских деревнях росли писатели Петро Глебка, Алесь Якимович, Алесь Пальчевский, Адам Русак и другие. Одна только деревня Низок дала белорусской литературе Павлюка Труса и Кондрата Крапиву. Соловьиные голоса у узденских девчат. Поэтому так далеко идет слава о Присынковском хоре, руководимом самодеятельным композитором и поэтом Шидловским. Вплетает свои песни узденский край в венок славы нашей Родины.

1 июня весь мир ежегодно отмечает как Международный день защиты детей. Этот день стал традиционным смотром решимости людей доброй воли бороться за мир и счастье будущего планеты. В Советском Союзе дети окружены заботой и вниманием с самого рождения. Им отдает свои знания и силы целая армия врачей, учителей, тренеров, артистов. Как признают в один голос иностранные туристы, в СССР есть один «привилегированный класс», и этот класс — советские дети **[«УСЁ ЛЕПШАЕ — ДЗЕЦЯМ»]**.

«КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ — НАВАСЁЛ» — так называется корреспонденция о сегодняшнем дне Могилева, города большой химии, машиностроения и металлургии, города школ и вузов. В этом году объем его промышленной продукции в пять раз превысит довоенный уровень и в 850 раз — дореволюционный. Во все уголки страны идут могилевские мостовые краны и скреперы, чугунные трубы и двигатели, вискозный шелк и целлофан, обувь и трикотаж. Быстрыми темпами ведется строительство. Каждый день новые квартиры получают 6—7 семей. А всего за последние пять лет новоселом стал каждый четвертый житель города.

«РАНА МЫ НАРАДЗІЛІСЯ...» — эти слова наших земляков-туристов из США поставлены заголовком к репортажу о их пребывании в родной Белоруссии. Мы уже давно привыкли к бурному темпу нашей жизни, к нашим гуманным законам, к нашим правам и льготам. Но люди, пятьдесят лет не видевшие родную землю, не перестают удивляться изменениям, которые произошли на ней. Побывав в различных учреждениях и на предприятиях республики, они воочию убедились, как высок материальный и культурный уровень жизни советского народа. Репортаж рассказывает о посещении земляками — друзьями «Русского голоса» — 4-й клинической больницы города Минска и колхоза имени Кирова в Слуцком районе.

М. Райцев сообщает из Англии о том большом впечатлении, которое произвел на наших земляков просмотр белорусских документальных фильмов. И. Сорока пишет о ширящемся в США движении против грязной войны во Вьетнаме и вмешательства во внутренние дела Доминиканской Республики. Их письма помещены под рубрикой **«ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ»**.

«КРАСНАПОЛЬСКІЯ АРТЫСТЫ» — под таким заголовком печатается заметка о Краснопольском народном театре, энтузиастами которого являются люди самых различных профессий: нормировщик совхоза В. Фещенко, директор школы И. Велюга, школьник С. Бородулин и др. Разнообразен репертуар театра, большим успехом пользуются его выступления.

«УСТУПЛЕННЕ Ў СВЕТ ЦУДОЎНАГА» — это рассказ о большом и благородном деле, взятом на себя Союзом композиторов СССР, — деле воспитания музыкальной культуры у миллионов детей. Для школьников всех возрастов проводятся в Москве и в союзных республиках концерты с участием лучших музыкантов и певцов, устраиваются лекции, которые читают преподаватели, музыковеды, композиторы. Председателем комиссии по эстетическому воспитанию молодежи является известный композитор Дмитрий Кабалевский. Циклы его замечательных лекций уже не раз транслировались по радио.

ЗЕМЛЯКІ-ТУРЫСТЫ ЗНАЁМЯЦЦА З САВЕЦКАЙ БЕЛАРУССЮ

„РАНА МЫ НАРАДЗІЛІСЯ...“

ЗДЗІЎЛЕННЕ, ЗАХАПЛЕННЕ

«Як удалося нашаму народу за такі невялікі адрэзак часу стварыць усё тое, што мы бачылі? Ды гэта ж трэба было, напэўна, працаваць дзень і ноч?..» Такое шчырае здзіўленне і захапленне нашай рэчаіснасцю ў словах Івана Дзмітрыевіча Матушака, што міжвольна спрабуеш паглядзець на ўсё, што стала для нас звычайным, вачыма гэтых людзей, старых мужчын і жанчын, якія не былі на Радзіме больш паўстагоддзя.

47 год... Гэта тэрмін існавання Савецкай улады. Але ж гэта менш, чым чалавечае жыццё, менш, чым пражылі нашы землякі за акіянам. Хіба многа можна зрабіць за такі параўнаўча кароткі час? Вельмі многа! Можна зрабіць шчаслівымі людзей на адной шостай частцы зямнога шара, пабудаваць сонечныя гарады, запусціць спадарожнікі, усё далей пранікаць у тайны Сусвету. Усё можна, калі краінай кіруе народ, калі ўсё, што ён стварае — для сябе. Мы даўно перасталі здзіўляцца цудоўным праяўленням савецкага ладу. Мы прывыклі да нашага імклівага будаўніцтва, да нашых гуманных законаў, да нашых парадкаў. Больш таго, нам часам здаецца, што так было заўсёды. Але прыязджаюць госці з-за мяжы — і на іх тварах, у іх пытаннях здзіўленне.

Самуіл Лабейка памятае дарэвалюцыйны, заштатны Мінск, дзе ледзь не самым лепшым будынкам была турма. Цяпер ён не пазнае горад, здзіўляецца яго хараству. Мікалай Папоў чацвёрты раз у Беларусі. Яму здавалася, што ў гэты раз ён не ўбачыць нічога новага. Але жодзінскія самазвалы, мінскія гадзіннікі, знаёмства з жыццём беларускай вёскі з'явіліся для яго прыемнымі сюрпрызамі. Васіль Ягоранка здзіўляецца таму, як хутка робяцца самазвалы-волаты.

Мы не знаходзім нічога незвычайнага ў тым, што аб савецкіх дзецях клапоціцца дзяржава з першага дня іх жыцця, што для самых маленькіх пабудаваны сады і яслі, што ўсе дзеці ідуць у школу, а для юнакоў і дзяўчат адкрыты дзверы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Мы не бярэмся меркаваць аб выхаванні падрастаючага пакалення ў Злучаных Штатах Амерыкі, але пытанне, якое задаў дырэктару школы Ігнат Маркевіч, гаворыць аб многім: «Ці быў у вас выпадак, каб вучань пагражаў настаўніку, кідаўся на яго з нажом?» Не, такога выпадку ў нас і быць не можа, таму што наша падрастаючае пакаленне выхоўваецца ў духу гуманізму. У нашых дзяцей многа цікавых і розных спраў. У Мінскім палацы піянераў турысты бачылі, як рэбяты малююць, шыюць, вышываюць, майструюць, спяваюць, ставяць спектаклі, іграюць на розных інструментах. Мікалай Васільевіч Папоў ад імя сваіх спадарожнікаў пажадаў поспехаў юным музыкам.

Нікога не здзівіш у Савецкай краіне і бясплатнай медыцынскай дапамогай. А вось госці нашы, здаецца, не зусім верылі ў гэта. Наведанне чацвёртай клінічнай бальніцы Мінска аказалася для іх карысным, адказала на шмат якія цікавіўшыя іх пытанні. У гэтым ім дапамагла Елена Міхайлаўна Сельдзіміра, галоўны ўрач бальніцы.

— Вы кажаце, што лячэнне ў вас бясплатнае, — заўважае Аляксандр Дубовік. — Але за лякарствы хворы ўсё ж плоціць. І я чуў, за тое, каб зуб уставіць, таксама трэба плаціць.

— У бальніцы лякарствы ўсе нашы пацыенты атрымліваюць бясплатна, але, калі чалавек лечыцца дома, то набывае медыкаменты за свае грошы. Калі вы зойдзеце ў аптэку, то самі пераканаецеся, што каштуюць яны літаральна капейкі. Каб уставіць зуб, плаціць таксама даводзіцца зусім нямнога, не больш чым рубель, два.

— Ды хіба гэта плата! Аб такіх грошах і гаварыць няма чаго. Вось у нас за гэта дзяруць з чалавека тры шкуры! — заўважае Васіль Ягоранка. — Мне ў мінулым годзе зрабілі аперацыю страўніка. Яна каштавала чатыры тысячы долараў!

— Ну, у такім выпадку наш хворы Мікула Іван Васільевіч можа лічыць, што яму пашанцавала, — усміхаючыся, гаворыць Сельдзіміра.

Справа ў тым, што ў гэту бальніцу не так даўно трапіў наш зямляк з Нью-Йорка Мікула. Прыехаў ён да сваіх родных у Слуцкі раён, але па дарозе захварэў. Даставілі хворага на санітарным самалёце ў Мінск і адразу паклалі ў бальніцу. Пасля кансіліуму ўрачы прыйшлі да вываду, што хвораму неабходна аперацыя. Яна прайшла ўдала. Турысты наведалі Івана Васільевіча ў палаце, і ён сам расказаў ім аб усім, што з ім здарылася.

— Вядома, каму гэта хочацца прыехаць у госці і захварэць? — сказаў ён. — Але хвароба ў мяне была запушчаная, усё роўна трэба было б аперыравацца. А тут гэта аперацыя мне нічога не каштавала... Сэканоміў свае зберажэнні, — пажартаваў ён.

Вялікія магчымасці былі ў нашых гасцей параўноўваць, аналізаваць. Яны памятаюць, што пакідалі тут да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яны выехалі з лапцюжнай Беларусі, і цяпер трэба быць сляпым або мець прадузяты погляд на жыццё ў краіне Саветаў, каб не заўважыць яе поспехаў.

НА СЛУЧЧЫНЕ

Нават цяжка сказаць, што больш спадабалася нашым землякам у калгасе імя Кірава Слуцкага раёна: ці то вялікія калгасныя статкі і свінафермы, ці то школа, а можа гасціннасць і хлебасольства гаспадароў, ці звонкія беларускія песні ў выкананні калгаснага хору. Добрае ўражанне зрабіла ўсё, разам узятае.

Калгас імя Кірава не лепшы ў рэспубліцы. Ёсць і большыя і багацейшыя. Ну, а гэты звычайны. Чаму экскурсія была іменна сюды? Мусіць таму, што ён не так далёка ад Мінска, усяго паўтары гадзіны язды па асфальтаванай шашы, а яшчэ таму, што многія землякі — выхадцы са Случчыны...

Восем вёсак уваходзяць зараз у склад гэтай гаспадаркі. Самая вялікая з іх — Казловічы. Тут, каля будынка калгаснага дома культуры, і спыніўся турысцкі аўтобус. Але заходзіць у памяшканне госці не спяшаліся.

— Якая шырокая, чыстая вуліца! І дамы дабротныя. А хто ж будуе вось гэты? — звяртаецца да старшыні калгаса Георгій Паўлавіч Крупіка, паказваючы на яшчэ не закончаны цагляны дом.

— Па праўдзе сказаць, я добра і не ведаю... У адным не сумняваюся: наш калгаснік будуе. Паглядзіце, колькі ў нас такіх новабудоўляў. Калгас прадастаўляе крэдыт забудоўшчыкам...

За сродкі арцелі ўзводзіцца некалькі шматпавярховых дамоў. У іх будуць вялікія і зручныя кватэры. Побач будынак універмага, а з другога боку — школа. Такой школе могуць пазайздросціць нават гараджане. Яна была пабудавана па праекце мінскага архітэктара, каштавала калгасу 360 тысяч рублёў. У школе фізічны, хімічны, біялагічны кабінеты і лабараторыі, спартыўная і актавая залы, бібліятэка. У гэты дзень для адзінаццацікласнікаў празвінеў апошні званок, упераздзе — экзамены на атэстат сталасці. Кім яны будуць, яшчэ невядома. Можа, праз чатыры-пяць год вернуцца сюды аграномамі, заатэхнікамі, заменяць старых, пайшоўшых на пенсію, будуць лячыць людзей у калгаснай бальніцы або кіраваць тэатрам. Вельмі многа тут таленавітых людзей. Казловіцкі хор ведаюць у Мінску, запрашаюць у Маскву. У ім спявае каля ста чалавек.

Праслухалі канцэрт і нашы землякі. Спадабаліся ім вясёлыя, жыццярадасныя беларускія песні «Родны край, мая Случчына», «Ганна замуж паляцела», «Прыязджайце да нас» і з густам зробленыя касцюмы артыстаў — белыя кашулі, упрыгожаныя чырвоным беларускім арнаментам, блакітныя, як лён, жылеты і расшытыя золатам паясы. У іх бачна традыцыя славутых слуцкіх паясоў.

Потым старшыня калгаса Сяргей Дзмітрыевіч Лямешчанка паказваў гасцям гаспадарку. Турысцкі аўтобус бачылі ў гэты дзень у розных канцах Казловіч. Землякі пабывалі ў летнім лагеры для жывёлы, на фабрыцы мяса, як называюць тут свінаферму, дзе ўтрымліваецца дзве з паловай тысячы жывёлін. Заходзілі ў хаты, размаўлялі з калгаснікамі.

На развітанне гасцінныя гаспадары ад шчырага сэрца пачаставалі дарагіх гасцей. Была тут і чарка, і багатая закуска, і сардэчнае цёплае слова.

ДА ПАБАЧЭННЯ, ЗЕМЛЯКІ!

26-е мая быў апошнім днём знаходжання нашых землякоў з Амерыкі на беларускай зямлі. Сем дзён у Мінску праляцелі хутка. Гэта быў тыдзень цікавых сустрэч, гарачых і доўгіх размоў з блізкімі, тыдзень, калі яны нанова знаёміліся са сваёй Бацькаўшчынай. На жаль, нашы госці не змаглі наведаць родныя вёскі, таму што гэта не было прадугледжана іх турысцкім маршрутам. Але і так яны ўбачылі вельмі многа, у многім зразумелі прынцыпы савецкага жыцця, пераканаліся ў тым, што наш народ жыве добра.

— Мы лічым, што СССР і ЗША не павінны ваяваць. Мы змагаемся за мір, мы заўсёды будзем на баку Савецкага Саюза, — сказаў ад імя ўсіх Самуіл Лабейка.

Прыемна было чуць такія словы. Яны сведчаць аб тым, што мірную палітыку нашай дзяржавы разумеюць і адабраюць усе сумленныя людзі.

Вечарам у рэстаране «Мінск» адбылася развітальная вячэра. З цёплымі словамі звярнуліся да гасцей старшыня прэзідыума Беларускага таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом народны артыст Савецкага Саюза Р. Шырма, прафесар А. Залескі, рэдактар зарубежнага вяшчання А. Стук, пісьменніца А. Васілевіч, рээмігрант са Злучаных Штатаў С. Афанасьеў.

Такімі ж сардэчнымі былі словы Мікалая Папова і іншых турыстаў, якія дзякавалі за добразычлівасць і гасцінасць, жадалі нашаму народу яшчэ большых поспехаў.

Раніцай 27 мая самалётам «ТУ-124» землякі вылецелі ў Маскву.

Шчаслівай вам дарогі! І да пабачэння!

Д. ЧАРКАСАВА.

Американцы в Крыму

Директора фирмы морских путешествий господина Вильяма Хаджинса из Нью-Йорка мы встретили в Ялте на шведском корабле «Стелла паларис». 138 американских туристов совершали на этом судне путешествие по странам Средиземноморья.

— За последние четыре года я шесть раз был в Советском Союзе и каждый раз впечатления остаются самые наилучшие, — сказал гость.

— Я был на всех континентах и видел много красивых мест. Но одним из самых лучших в мире считаю Ялту. Сейчас, — продолжал Вильям Хаджинс, — основная масса туристов прибыла из штата Калифорния, их не удивишь красотами природы. Но Крымским побережьем они остались очень довольны.

Американцы с большим интересом знакомятся с жизнью Советского Союза.

С. ШАНТЫРЬ, АПН.

Добра іграюць юныя музыканты Мінскага палаца піянераў.

Гасцей цікавіла якасць будаўніцтва ў калгасе імя Кірава Слуцкага раёна.

Фота **С. Ананкі.**

Прадпрыемствы Яраслаўля, Омска, Варонежа і іншых гарадоў краіны атрымалі першыя партыі беларускага корду. Паўтара мільёна метраў высокатрывалай тканіны сыйшло ўжо са станкоў Светлагорскага завода штучнага валакна.

Фота Ч. Мезіна.

(Пачатак на 1-й стар.).

Сцежкамі Прынямоння

гадаваліся мастак Юзік Пучынскі, паэты Казлоўскі, Шавель, празаік Алесь Пальчэўскі.

А Нёман плыве ды вядзе. І вось у зялёным вянку садоў, каштанаў, высокіх ліп калгас «Нёман». Багаты калгас. На пясчаным узгорку вялікі клуб, сярэдняя школа, бальніца, сельмаг. У вытоках Нёмана плаваюць чароды качак, гусей. Белым бела на рацэ. А на левым беразе ракі — вёска Замосце.

Бедна жылося жыхарам гэтай вёскі да рэвалюцыі. Нарадзіўся ў гэтай беднасці і хлопчык Ілья. А калі падрос, пагнала галеча юнака кавалка хлеба шукаць. Аж да самага Піцера загнала. Рабочым стаў сялянскі хлапец. Тут у вялікую партыю Леніна ўступіў Ілья Данілавіч Гурскі. Новую долю здабываў са зброяй у руках у вялікім полымі рэвалюцыі. Паважаным чалавекам зрабіўся Ілья Данілавіч. Многа кніг напісаў.

А сцежка берагам бяжыць, у вёску Нізок прывяла. Вялікая, доўгая вёска. Многа слаўных людзей жыве ў Нізку. Амаль не знойдзецца такога чалавека ў раёне, каб не чуў, не ведаў пра той Нізок. А я вам скажу, чаму гэта так. Тут нейкі дзівосны гадавальнік пісьменнікаў, артыстаў, настаўнікаў, аграномаў. Усяму нашаму краю вядома імя паэта-лірыка Паўлюка Труса. Гэта ён, яшчэ будучы юнаком, напісаў паэму «Дзесяты падмурак». Гэта ён, шчыры, сардэчны юнак, закахаўшыся ў нізаўскую красуню, пісаў:

Алеся, бедная Алеся,
Дзіця наднёманскіх нізін...

І быў голас паэта «чысты, светлы, як з расы».

Многа ў Нізку здольных спевакоў, пачынаючых паэтаў, празаікаў, між іх выгадаваліся народны артыст рэспублікі Анатоль Трус і літаратурны крытык Ліда Арабей. Арабей — кандыдат філалагічных навук. А вяршыня славы Нізка — Кандрат Крапіва, народны пісьменнік рэспублікі. Яшчэ хлапчуком я так захапляўся ягонымі байкамі, што пад іх уражаннем сам напісаў нейкую недарэку-байку і паставіў пад ёю подпіс — Крапіва. Я тады па сваёй наіўнасці думаў, што толькі гэтым прозвішчам дазволена падпісваць байкі. Шчыра, да слёз я рагатаў, калі глядзеў спектакль у нашым Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы па п'есе Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім». У залаты фонд нашай драматургіі ўвайшлі яго п'есы «Пяюць жаваранкі», «Мілы чалавек», «Людзі і д'яблы» і многа іншых.

Прайшоўшы мост, на левым беразе Нёмана ўбачыш будынкі вёскі Пясочнае. Добрымі песнярамі-паэтамі можа ганарыцца і Пясочнае. Тут пачаў пісаць першыя вершы Анатоль Астрэйка. Многа кніжак выдаў паэт. На многія яго паэтычныя тэксты напісана музыка. Па ўсёй краіне прагучэла песня:

Ой, Нёман, ой, бацька мой Нёман,
Як сонца, як дзень, дарагі!..

А ці знойдзецца такі чалавек у нашай Бацькаўшчыне, які б не ведаў трошкі жартоўную, шчырую застольную песню:

Бывайце здаровы,
Жывіце багата...

Тэкст гэтай песні напісаў паэт Адам Русак — мой зямляк з Наднёманшчыны.

І коцяцца па лугах і дубровах, і плывуць па рацэ працяглыя зажынкі, дажынкі, вяснянкі, калыханкі — песні працы і радасці плывуць пад сонцам вялікага веку.

Ці не пра гэты цудоўны кут у народзе ходзіць легенда такая: ідуць падарожнікі-вандроўнікі дзень, ноч ідуць, чуюць: хтосьці грае, а дзе і хто — не бачаць. Адзін кажа: «Гэта здань», другі: «Гэта трава пяе», толькі трэці, прыклаўшы вуха да зямлі, выгукнуў: «Браткі! Тут такая зямля!»

Такая зямля, такія цудоўныя людзі на гэтай зямлі. Сваёй працаю ўздымаюць яны славу Бацькаўшчыны ў прасторы касмічныя. У сваіх сэрцах нясуць гэтыя людзі вясну-красну, вясну чалавецтва, якую даў векапомны Кастрычнік. У вянок нашай славы, у вянок нашага шчасця ўплятаюць гэтыя людзі свае песні. І вядуць, і нясуць яны ўсё далей, усё наперад.

Вясна на Нёмане.

Фотаэцюд А. ЗМІТРОВІЧА.

OPPORTUNITY

A recent visit to my father's birth place in western Byelorussia proved to be a very fruitful visit in more ways than one. Not only was I welcomed and accorded the hospitality of a very welcome guest, I was also given a keepsake that to me is priceless. One of my aunts gave me a school testimonial of good conduct and progress, issued to my father in the year of 1905. Not only is this gift a keepsake, but it also started me on a small research mission. I became curious as to who has the opportunity to receive a higher education in the Soviet Union today.

Being a student myself, getting the answers that I was looking for wasn't very difficult. I decided to make my enquiries directly to the students themselves.

My first stop was at one of the hostels that houses foreign students. Students from Vietnam, Cuba and many African countries. At the hostel the foreign students live together with their Soviet counterparts. Everyone at the hostel seems to live as one big happy family. Not only do Soviet and foreign students share rooms together, they share all their facilities and problems together. Helping each other with problems of study and any other difficulties that may arise.

My next stop was at a dormitory that houses students of many faculties: mathematical, biological, geological and philological. Among the Soviet students I found that not only do they come from Byelorussia, but from all parts of the country. Upon asking these young people how they entered the University and what their social backgrounds were, I received many different answers. I found, that young people from cities, small towns and collective farms study at the University, regardless of their personal wealth. Not only are they given the opportunity to study without any type of fee, they are given stipends to help them along financially. They are also given quarters at student dormitories, and cafeterias are conveniently located for their use. These cafeterias are located at the hostels, the University and throughout the city. The prices here are lower than at other eating places.

On entrance to the University and how this is accomplished, I received only one answer. Future students desiring to study, are required to take entrance exams. They come to Minsk during the summer months to do this.

The one and only conclusion that I could come to after this small survey was, that in the Soviet Union everyone has the opportunity to get a higher education, and during the years of student life everything is made a little easier for them. The only thing that the government demands of them is that they study. And this is exactly what they are doing. Students from all the corners of the world, studying together, living in friendship, and helping each other to become better citizens of the world. This is what I found during my little research tour.

A. NIKOLAUK.

·ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ·

У АМЕРЫЦЫ шырыцца рух супраць вайны ў В'етнаме і ўмяшання ЗША ў справы Дамініканскай Рэспублікі. Перад Белым домам прайшлі дэманстранты з плакатамі: «Не пойдзем на вайну!», «Досыць бамбіць мірны в'етнамскі народ!» У Каліфорніі таксама адбылася вялікая дэманстрацыя. 40 студэнтаў, якія атрымалі вайсковыя павесткі, спалілі іх, попел ссыпалі ў труну і напісалі на ёй: «Не пойдзем ваяваць у В'етнам і Дамініку! Не хочам вайны!». Многія амерыканцы адпрайляюць у кангрэс петыцыі пратэсту. Усё больш людзей разумее, што трэба выратаваць свет ад трэцяй сусветнай вайны.

І. САРОКА.

ЗША.

ДНЯМІ мы тут наладзілі прагляд дакументальных фільмаў аб Беларусі. Бачылі трактарны і аўтамабільны заводы, Мінскі оперны тэатр і майстэрню скульптара Азгура, слухалі Петруся Броўку і Ларысу Александроўскую. Жанчыны нават плакалі ад хвалявання, ды і ў мужчын павекі былі чырвоныя. Пасля доўга яшчэ сядзелі і гаварылі, слухалі беларускія і рускія песні.

Быў я ў Барысенкі. Ен працуе зараз дзень і ноч, каб зарабіць грошай для новай паездкі на Радзіму. Хоча сёлета прыехаць аж на два месяцы.

Кнігу «Праз туманы», дзе апісваюцца падарожжы — Барысенкі, Шчэрбацэвіча і маё — ў родныя мясціны, мы чыталі ўсёй сям'ёй. Засталіся ёю задаволены.

М. РАЙЦАЎ.

Англія.

ЕГО КНИГИ ЧИТАЕТ ВЕСЬ МИР

«Я лично считаю, что человеку при жизни не следует сооружать памятников. Но что поделаешь, если Михаил Александрович Шолохов своим искусством воздвиг себе памятник в мировой литературе», — такую оценку творчеству Шолохова дал известный финский писатель Мартти Ларни. А какую оценку его произведениям дали читатели? Пусть на этот вопрос ответят цифры.

Тираж произведений Шолохова, выпущенных в Советском Союзе только на русском языке, составляет 37 335 000 экземпляров и на языках братских республик— 3 145 000 экземпляров. Только «Тихий Дон» в США и Англии издавался 26 раз, на немецком языке — 14, на французском — 7. «Судьба человека» вышла за рубежом 46 изданиями, не считая публикаций в периодической печати, а «Поднятая целина» печаталась 138 раз. Общий тираж произведений Шолохова, изданных во всем мире на 73 языках, составлял на 1 января 1965 года, по данным Всесоюзной книжной палаты, 41 099 000 экземпляров.

Михаилу Шолохову исполнилось 60 лет. Эту дату отмечает не только наша страна. Творения русского писателя стали достоянием всего человечества. «Что дает нам Шолохов? Он пробуждает скрытый в наших душах огонь, приобщая к великой доброте, великому милосердию и великой человечности русского народа», — пишет французский писатель Жан Катала.

В Белоруссии Шолохов любим с тех давних дней, когда к нам дошли первые книги молодого автора «Тихого Дона». С тех пор Шолохов прочно владеет сердцами белорусских читателей.

Сотни, тысячи писем получает Михаил Александрович от благодарных читателей. Вот одно из них, пришедшее в Вешенскую из Бельгии.

«...Ваше навеки прославленное произведение «Тихий Дон» для нас явилось настольной книгой, можно без преувеличения сказать, перевоспитало нас здесь, за границей. Пишущий Вам эти строки, старый эмигрант, воспитанник Таганрогской мужской гимназии, Попандапуло Николай Михайлович, в силу хорошо Вам известных обстоятельств гнусным обманом белых генералов... был вовлечен в белое движение и прошел тяжелый путь гражданской, начиная с отряда Семилетова, так ярко описанного на страницах «Тихого Дона»... За рубежом, очутившись в чужой среде, мы не утратили своих святых чувств любви к Родине, не утратили веры в свой народ. Во многом нам помогла советская литература: «Тихий Дон», «Хождение по мукам» и другие книги служили нам подлинными маяками...»

Григорий Мелехов с Аксиньей, их неутоленная и горькая любовь, их трудные перепутанные тропинки... Коммунисты Давыдов, Нагульнов, их чистая вера в правоту своего дела, борьба и смерть во имя жизни и счастья других... Солдат Андрей Соколов, прошедший кромешный ад фашистского плена, человек с несгибаемой гордостью советского патриота... Шолоховские образы вошли в сокровищницу мировой литературы, как стихи Пушкина, Лермонтова, Есенина, Маяковского, как проза Толстого, Тургенева, Чехова. Читатели с нетерпением ждут новой книги замечательного художника. «Они сражались за Родину» — так называется новый роман, над которым давно уже работает писатель. Эта книга о советских людях, отстоявших свободу своей земли.

Шолохов широко известен не только как писатель. В годы войны он—военный корреспондент, в мирное время — партийный работник, депутат Верховного Совета СССР, активный участник движения борцов за мир.

Отмечая 60-летие любимого писателя, его многочисленные читатели желают ему долгих лет жизни и новых творческих побед.

КРАСНАПОЛЬСКІЯ АРТЫСТЫ

Яшчэ ў першыя гады Савецкай улады ў Краснаполлі быў створан гурток аматараў сцэны. Ён ажыццявіў пастаноўкі такіх складаных твораў, як «На дне» і «Дзеці сонца» М. Горкага, а таксама п'ес, у якіх адлюстроўвалася барацьба народа за Савецкую ўладу.

Любоў да тэатральнага мастацтва, нібы спадчына, перададзена маладому пакаленню. У рэпертуары Краснапольскага народнага тэатра — «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Калінавы гай» А. Карнейчука, «Выбачайце, калі ласка» і «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка, «Не верце цішыні» І. Шамякіна, «Папараць-кветка» І. Козела, «Барабаншчыца» А. Салынскага, «Чырвоныя кветкі Беларусі» В. Гарбацэвіча і іншыя.

Артысты тэатра — гэта людзі самых разнастайных прафесій, розных узростаў. На сцэне вы можаце ўбачыць нарміроўшчыка саўгаса імя Калініна В. Фешчанку, намесніка загадчыка раённага аддзела культуры Ф. Лісічкіну, сакратара раённага аддзялення таварыства «Веды» І. Гараўскага, дырэктара школы І. Вялюгу, вучняў старэйшых класаў і іншых. Гэтых людзей аб'ядноўвае вялікая любоў да тэатральнага мастацтва. Яны бескарысліва аддаюць свой вольны час, багацце душы людзям. Многія артысты павышаюць свае веды ў спецыяльных навучальных установах. Напрыклад, Сяргей Агеенка скончыў тэатральнае аддзяленне культасветвучылішча, Фаіна Лісічкіна завочна займаецца ў Народным універсітэце мастацтваў у Маскве.

Калектыў тэатра не абмяжоўваецца толькі выступленнямі ў сваім раёне. Артыстам не раз апладзіравалі гледачы Крычава і Чэрыкава, Чавус і Слаўгарада, Мсціслаўля і Клімавіч, Касцюковіч і Хоцімска. Тэатр выступаў таксама на сцэне абласнога драмтэатра і ў Мінску.

С. СЯМЕНАЎ.

Сцэна са спектакля «Чырвоныя кветкі Беларусі» ў выкананні Краснапольскага народнага тэатра.

Фота Ул. Лук'яненкі.

Родная зямля

А. ТРЫНДА

[Працяг. Пачатак у №№ 21, 22].

10

Мікалай працягваў наладжваць сувязі ў вёсках Косаўскага, Слонімскага, Ружанскага раёнаў, ствараў там падпольныя ячэйкі, члены якіх тайна прыходзілі ў наш дом, хоць становішча ў горадзе было цяжкае. У Косаве з'явілася некалькі здраднікаў, памагатых акупантаў, і трэба было праяўляць асцярожнасць. Найбольш актыўныя савецкія работнікі былі арыштаваны і расстраляны. Некаторым з іх па-варварску адсеклі галовы. Так загінулі Міхаіл Грэцкі, Павел Лазоўскі, Іван Максімчык, Фама Цяменя і іншыя. Але нягледзячы на сур'ёзныя цяжкасці, ніхто з падпольшчыкаў ні на хвіліну не спыняў сваёй дзейнасці.

11

Падпольную работу ў раёне вёў таксама Аляксандр Мініч (падпольная мянушка «Волкаў») — адзін з кіраўнікоў партызанскага атрада імя Дзімітрава. Мікалай звязаўся таксама з косаўскім шаўцом Ісафонем, які стаў актыўна дапамагаць нам. Рамонт абутку — вельмі зручны від сувязі, і нашы таварышы выдатна карысталіся ім, заходзілі да Ісафоні, а праз яго падтрымлівалі сувязь з падполлем.

На нашу канспіратыўную кватэру прыйшлі таксама Якаў і Соф'я Казімірчыкі — муж і жонка, якія жылі на маленькім хутары непадалёку ад Косава.

Мікалай сказаў ім:

— Нам неабходна ваша дапамога. Вы жывяце на хутары, паблізу лесу і ўдалечыні ад людзей. Нам спатрэбіцца ваша кватэра: у вас вельмі зручна хаваць зброю.

Абодва адразу адказалі згодай. Усю вайну хата Казімірчыкаў была своеасаблівай рэзідэнцыяй партызанскага штаба.

***

Прыйшла да мяне аднойчы Надзежда Глушко, якая працавала ў нямецкім шпіталі, і расказала:

— У нас ляжыць жанчына з Івацэвічаў — Марыя Уласава. Муж яе ў партызанах, а яе збілі немцы.

— За што?

— Пайшла яна неяк на станцыю і ўбачыла, як немцы везлі ў цяплушках груды трупаў сваіх салдат, якія загінулі на ўсходнім фронце. Яе злавілі і збілі за цікаўнасць. І ўяўляеш, яна ганарыцца тым, што даведалася пра тайну немцаў, усім расказвае аб гэтым. Хочаш, я прывяду яе да цябе?

12

Я згадзілася. Праз некалькі дзён Уласава пабывала ў мяне. Яе расказ мы распаўсюдзілі сярод насельніцтва. Ён дайшоў і да партызан.

Потым я пазнаёміла Надзежду з Мікалаем. Яна стала актыўна дапамагаць нам, галоўнае — прыносіць медыкаменты са шпіталя. Мы збіралі іх для будучага партызанскага атрада і хавалі на хутары.

Явачная канспіратыўная кватэра ў Косаве па-ранейшаму была на маёй адказнасці. Тут, як і раней, сустракаліся нашы таварышы, збіраліся нарады, прымаліся ў падполле новыя члены.

Вясной 1942 года прыйшоў да нас з Ружан і Дзмітрый Станкевіч — стары рэвалюцыянер, які адседзеў у польскіх турмах дзевяць з палавінай год. Да гэтага я не была з ім знаёма і, зразумела, аднеслася да яго з асцярожнасцю, уважліва прыглядалася да гэтага невысокага бландзіна ў акулярах. Паціхеньку адправіла Стэлу за Мікалаем, той хутка прыйшоў. Мужчыны адразу пазналі адзін другога, абняліся. Станкевіч сказаў:

— Я ўпаўнаважаны перадаць табе, Мікалай, заданне ад вядомага табе таварыша — Урбановіча. Ён зноў сярод нас, працуе на Палессі ў тыле ворага. Цяпер ён сакратар Брэсцкага падпольнага камітэта. Прасіў перадаць, што ЦК зацвердзіў цябе сакратаром Косаўскага раённага камітэта.

Ці трэба гаварыць, як натхніла нас гэтая вестка? Аказваецца, мы не адны! Больш таго, нашу дзейнасць зацвярджаюць кіруючыя арганізацыі. Акрыляла і тое, што Урбановіч зноў з'явіўся ў нашых краях. Яго добра ведалі і любілі ў Заходняй Беларусі. Тут ён быў больш вядомы пад сваёй падпольнай мянушкай «Максім».

Справы нашага падполля пайшлі яшчэ лепш.

Актыў, што згрупаваўся вакол Косаўскага камітэта, ячэйкі ў вёсках адыгралі вялікую ро-

Из заявления ТАСС

По поводу выступления президента США Л. Джонсона

Прошло два десятилетия с тех пор, когда объединенными усилиями стран антигитлеровской коалиции был повержен в прах агрессор, принесший неисчислимые бедствия и страдания миллионам и миллионам людей. Но не исчезла и не могла исчезнуть боль утрат, свежа память о павших на полях сражений, о замученных в гестаповских застенках и лагерях смерти.

Вспоминая о годах второй мировой войны, оценивая все то, что произошло в мире с того времени, люди повсюду обращают свои мысли к настоящему и будущему с надеждой, что трагедия мировой войны больше никогда не повторится.

Выступил с заявлением по случаю двадцатой годовщины со дня окончания второй мировой войны в Европе и президент США Л. Джонсон. Естественно, что выступление руководителя одной из держав, которая входила в антигитлеровскую коалицию, не могло не привлечь внимания, тем более, что оно посвящено урокам второй мировой войны и выводам из нее на будущее. Что же показывает это выступление президента США?

Содержание заявления президента США, его принципиальные политические установки таковы, что они не могут не насторожить всех, кому дорого дело мира и безопасности народов.

Говоря о второй мировой войне, президент США не сказал ни слова о том, кто развязал эту войну, ради чего сражались и проливали кровь народы. Он не счел нужным даже упомянуть, что эта война велась против германского фашизма, против гитлеровской тирании. В Вашингтоне, похоже, хотят теперь даже вытравить память о том, что существовала антигитлеровская коалиция, о боевом содружестве Советского Союза, Соединенных Штатов Америки, Великобритании, Франции и многих других стран.

У президента Л. Джонсона не нашлось ни одного слова, чтобы сказать о решающем вкладе, который внесли в дело победы над фашистской Германией Советский Союз, наш советский народ, чтобы отдать дань уважения и признательности миллионам советских людей, павших в борьбе за разгром гитлеризма. Но никому и никогда не удастся принизить роль советского народа в спасении народов Европы и мира от фашистской чумы. Можно в этой связи напомнить слова президента США Франклина Д. Рузвельта: «Красной Армии и народу Советского Союза принадлежат вечная честь и слава. Они вписали бессмертные страницы в историю борьбы против тирании и гнета. Их пример и самопожертвование вдохновляют все силы, объединенные в совместной борьбе за победу».

Так говорил в свое время президент Рузвельт. То, что теперь говорит президент Джонсон, лишний раз показывает, как далеко отошли те, кто определяет сейчас американскую политику, от целей, ради которых народы вели войну против фашизма.

Наглядным примером этого могут служить высказывания президента Л. Джонсона о Западной Германии, представляющие собой попытку оправдать проводимый США курс на возрождение в Западной Германии милитаризма и реваншизма. Еще раз с американской стороны заявлено о том, что все страны НАТО, — а это значит, прежде всего, Западная Германия, — «имеют право участвовать в коллективной ядерной обороне». Что это, как не прокладывание пути к ядерному оружию для западногерманских милитаристов, т. е. для тех же кругов, которые привели к власти Гитлера, развязали вторую мировую войну, а теперь в попытке ревизовать её итоги способны ввергнуть Европу и весь мир в новую военную катастрофу.

В своем выступлении президент США фактически подхватывает требования западногерманских реваншистов, домогающихся ликвидации Германской Демократической Республики, социалистических завоеваний ее народа. США, заявляет он, готовы «в полной мере сыграть свою роль» в мероприятиях, нацеленных на то, чтобы покончить с порядками, существующими в ГДР.

Но президенту США не дано распоряжаться судьбами независимых суверенных государств. Уже шестнадцать лет живет и развивается Германская Демократическая Республика, выражающая интересы и чаяния всего германского народа. Социалистическое государство германского народа вместе с Советским Союзом и рядом других социалистических стран входит в оборонительный союз — организацию Варшавского договора. А это значит, что тот, кто попытался бы претворить в жизнь авантюристические планы против Германской Демократической Республики, столкнулся бы с объединенной мощью всех государств — участников Варшавского договора.

Не только германской проблемы, но и положения в Европе в целом касается президент США в своем выступлении. Ему не нравится, как складываются дела в этом районе мира, он не оставил надежд на вытеснение социализма из Европы и призывает к «созданию Европы, единой по целям и характеру», разумеется, по западному образцу. Президент США забывает, однако, что он вовсе не является хозяином судьбы европейских народов. Народы тех европейских стран, которые установили у себя социалистический строй, сделали это по своей суверенной воле и навсегда, и они не позволят ни США, ни кому-либо другому вмешиваться в их внутренние дела.

Соединенные Штаты расширяют войну в Южном Вьетнаме, не останавливаясь перед использованием напалма и ядовитых газов против мирного населения. Они прибегают к варварским бомбардировкам территории Демократической Республики Вьетнам. Стоило народу Доминиканской Республики подняться на борьбу со своими угнетателями, как и в эту маленькую страну были брошены десятки тысяч солдат американской морской пехоты и воздушно-десантных войск.

Нет, не в роли строителей цивилизации, как это хочет представить американский президент, а в роли жандарма выступают Соединенные Штаты Америки на мировой арене. Не свободу народов они защищают, а пытаются с помощью силы остановить исторический процесс распада старого мира, мира угнетения и колониализма. Правящие круги США хотели бы задушить национально-освободительное движение народов и снова вернуть мир к временам колониальных империй. Но эти времена ушли в прошлое безвозвратно.

В связи с выступлением президента США Л. Джонсона складывается впечатление, что исторические уроки последних десятилетий прошли мимо его сознания. Такой вывод напрашивается и потому, что снова применяется фразеология антикоммунизма вроде рассуждений о «железном занавесе», о восстановлении Европы в «широких исторических границах», звучат призывы к объединению государств «атлантической цивилизации», прикрывающие попытки сколотить союз сил агрессии против социалистической системы и национально-освободительного движения народов.

Что же, по этому поводу можно сказать с уверенностью — то, что оказалось не под силу империалистам в прошлом, тем более обречено на провал теперь, когда на мировой арене произошли коренные изменения в соотношении сил.

По меньшей мере странным выглядит в заявлении президента США, пропитанном враждебностью к силам социализма и национального освобождения, утверждение о том, что американское правительство намерено искать соглашений с Советским Союзом в интересах разрядки напряженности. Наша позиция в этих вопросах хорошо известна. Она еще раз ясно изложена в Обращении Центрального Комитета КПСС, Президиума Верховного Совета СССР и Советского правительства к правительствам, парламентам и народам всех стран по случаю двадцатилетия победы над гитлеровской Германией. Советское правительство всегда проявляло готовность к серьезным переговорам и заключению соглашений, направленных на предотвращение войны, укрепление мира и обеспечение безопасности всех народов. Но никто не должен рассчитывать на то, что можно вмешиваться во внутренние дела независимых государств, провоцировать то здесь, то там вооруженные конфликты, совершать акты агрессии против социалистических стран и в то же время договариваться с Советским Союзом о каких-то соглашениях, о «разрядке напряженности».

Выступление президента США подтверждает, что в Вашингтоне, судя по всему, берет все больше верх линия на обострение международной обстановки.

В официальных советских кругах считают, что, вставая на такой путь, руководители США берут на себя всю тяжесть ответственности за возможные последствия их политики. Этот курс идет вразрез с интересами народов всего мира, он не сулит ничего хорошего ни одному государству, в том числе и Соединенным Штатам Америки.

Советский Союз твердо стоит на страже мира. Но он готов к любому обороту событий, и пусть на этот счет не заблуждаются те, кто хотел бы возродить обанкротившуюся политику «с позиции силы».

В марионеточной южновьетнамской армии все чаще проявляются антиамериканские настроения.

«Взаимодействие».
«Дойче фолькецайтунг», Дюссельдорф.

13

лю ў стварэнні партызанскіх груп, якія пазней уліліся ў атрад імя Дзімітрава, а потым і ў партызанскую брыгаду імя Панамарэнкі. Многія актывісты пайшлі ў лес, а частка іх яшчэ заставалася на месцах для сувязі, для аказання дапамогі партызанам.

З фронту паступалі трывожныя весткі. Немцы захапілі Кіеў, уварваліся ў Калінін, прасоўваюцца да Тулы... А потым мы даведаліся аб вялікай перамозе Савецкай Арміі пад Масквой. Яна мела вялізарныя вынікі і для нас. Партызанскі рух ва ўсіх акупіраваных фашыстамі абласцях адразу ажывіўся.

Усё часцей ляцелі пад адхон варожыя эшалоны з жывой сілай і тэхнікай, палалі на косаўскіх дарогах фашысцкія аўтамашыны.

Праз некаторы час Мікалай паведаміў мне, што партызаны брыгады імя Панамарэнкі вырашылі атакаваць косаўскі гарнізон. Ён спытаў, ці магу я ўдакладніць колькасць салдат у гарнізоне, размяшчэнне агнявых кропак, нямецкіх пастоў і застаў на подступах да Косава, даведацца, у якія гадзіны яны мяняюцца.

Даведацца пра гэта мне ўдалося праз нашага «паліцэйскага», глыбока заканспіраванага таварыша. А хутка нямецкі гарнізон быў атакаваны, выбіты з Косава.

Падпольны камітэт апублікаваў зварот да насельніцтва горада, заклікаючы яго да спакою, а ўслед за гэтым разгарнуў планамерную масавую работу, выкрываючы фашысцкі «новы парадак», умацоўваючы ўпэўненасць у перамозе над гітлераўскай Германіяй і заклікаючы народ да далейшай барацьбы з ворагам. Горад заставаўся ў руках партызан да глыбокай восені.

Гітлераўскае камандаванне, раз'юшанае размахам партызанскага руху, кінула на барацьбу з народнымі мсціўцамі вялізарныя сілы, цэлыя дывізіі карнікаў.

14

Па распараджэнні Хойзінгера ў канцы 1942 года была ўведзена ў дзеянне «інструкцыя аб барацьбе з партызанамі на Усходзе», у якой загадвалася браць заложнікаў, расстрэльваць усіх, западозраных у сувязях з партызанамі, знішчаць насельніцтва цэлых вёсак. Але гэта толькі выклікала новую хвалю народнай барацьбы. У партызаны ішлі рабочыя, калгаснікі работнікі савецкіх устаноў, інтэлігенцыя, а таксама воіны Савецкай Арміі, якія трапілі ў першыя дні вайны ў акружэнне.

Наш партызанскі аэрадром прымаў самалёты з Вялікай зямлі. Мы ўстанавілі сувязь і з Беларускім штабам партызанскага руху, які аказваў усё ўзрастаючую дапамогу зброяй, боепрыпасамі, сродкамі сувязі і інш. Вялізарную ролю адыгралі і беларуская газеты, падтрымліваючы ў партызан баявы дух і ўпэўненасць у перамозе.

Удары па гітлераўцах, якія нязменна ўзмацняліся, нягледзячы на аблавы і «прачоскі» лясоў, рабіліся для ворага цяпер куды больш адчувальнымі. Партызанскі рух на часова акупіраванай фашыстамі тэрыторыі Беларусі стаў сапраўды ўсенародным.

Толькі косаўская раённая падпольная арганізацыя ў жніўні 1943 года аб'ядноўвала 137 членаў. У 64 населеных пунктах раёна было 44 ячэйкі. У Косаве дзейнічала таксама гарадская падпольная арганізацыя, у склад якой уваходзіла больш 120 членаў. Яны перадалі партызанам шмат зброі і ўзрыўчаткі. Гэта было даволі адчувальным дадаткам да таго, што партызанская брыгада здабывала ў баях.

А потым у маім жыцці здарылася страшэннае — мяне арыштавалі і адправілі ў Асвенцімскі канцлагер. Толькі пасля вайны я даведалася аб трагічнай гібелі майго брата. Ён не дажыў да вялікага дня Перамогі ўсяго год...

(Заканчэнне будзе.)

Мнение японцев

В Японии был проведен конкурс на лучшее письмо президенту Джонсону. В задачу его участников входило изложить свои мысли по поводу положения в Южном Вьетнаме. Из тысяч писем организатор конкурса — популярный журнал «Сюкан Асахи» — отобрал три самых ярких и направил их в Вашингтон. Ответ не заставил себя ждать. Правда, подписал его не Джонсон, а посол США в Японии Рейшауэр.

Японцы давно прозрели в отношении подлинного характера американской политики во Вьетнаме, а доказывать, что белое есть черное и наоборот — задача нелегкая. Поэтому и пришлось американскому послу заниматься фальсификацией.

Решительная отповедь послу содержится в опубликованном в том же номере журнала «Сюкан Асахи» письме писателя Кэн Кайко. Мнению Кайко можно доверять. Он прекрасно осведомлен о положении в Южном Вьетнаме, где недавно побывал сам.

Чтобы уничтожить партизан, замечает он, вам надо уничтожить 14 миллионов южновьетнамцев. Народ питает недоверие и отвращение к большинству политических деятелей и генералов сайгонского правительства, так как знает — они погрязли во взяточничестве, коррупции, прогнили до мозга костей.

Какой же совет дает в заключение японский писатель американцам? Учтите, пишет он, несмотря на все ваши разговоры о необходимости защищать «свободу и мир в Южном Вьетнаме», вам не удастся приостановить ход истории.

Яснее о мнении японцев по поводу американской агрессии в Индокитае не скажешь.

Б. ЧЕХОНИН.
г. Токио.

ЯКАСЦЬ ГАРАНТУЕЦЦА

КАРЫСТАЙЦЕСЯ ПАСЛУГАМІ «ЗНЕШПАСЫЛГАНДЛЮ»

Многія суайчыннікі, якія пражываюць у розных краінах свету, звяртаюцца да нас з пытаннем, як купіць тавары савецкай вытворчасці для сябе, а таксама, каб падарыць іх родным і знаёмым за мяжой і на Радзіме.

Ідучы насустрач гэтым пажаданням, мы публікуем інфармацыйную аб'яву Усесаюзнага экспартна-імпартнага аб'яднання «Знешпасылгандаль», якая тлумачыць умовы пакупкі і перасылкі тавараў.

Усесаюзнае аб'яднанне «Знешпасылгандаль» прадае на свабодна канверсуемую валюту дробнааптовымі партыямі ў шырокім асартыменце савецкія прамысловыя і харчовыя тавары з дастаўкай іх заказчыкам на тэрыторыі СССР і ў іншыя краіны, а таксама бяспошлінна ўручае заказаныя іншаземцамі савецкія тавары ў якасці падарункаў іх родным, якія жывуць у СССР.

«Знешпасылгандаль» прапануе: легкавыя аўтамабілі, матацыклы, матаролеры, халадзільнікі, пральныя і швейныя машыны, разнастайныя электрабытавыя тавары, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, піяніна і іншыя музычныя інструменты, аматарскія кінаапараты, фотаапараты, бінокліі, гадзіннікі, розныя тавары шырокага ўжытку, уключаючы ўсялякія тканіны, парфюмерыю, а таксама харчовыя тавары, у тым ліку: савецкія марачныя віны, каньякі, гарэлку, зярністую ікру, вялікі выбар кандытарскіх, гастранамічных, бакалейных і многіх іншых тавараў.

Высокая якасць тавараў і тэрміновая іх дастаўка гарантуюцца.

«Знешпасылгандаль» таксама прадае іншаземцам пуцёўкі ў савецкія санаторыі і дамы адпачынку для іх сваякоў, якія пражываюць у СССР. Каталогі і неабходную інфармацыю можна атрымаць па адрасе: СССР, Масква, Г-200, «Знешпасылгандаль», а таксама праз наступныя фірмы:

ЗША	—«Пэкедж Экспрэс Компані»—Нью-Йорк
	—«Глос Парсел Сервіс»—Філадэльфія
	—«Космас Экспрэс Карпарэйшн»—Нью-Йорк
	—«Сентрал Парсел Сервіс Інк»—Чыкага
	—«Юніён Турс»—Нью-Йорк
	—«Грамерсі Шыпінг Компані»—Нью-Йорк
КАНАДА	—«Украінская кніга»—Таронта
АНГЛІЯ	—«Дынерман энд Компані»—Лондан
	—«Брыціш энд форн Экспарт»—Лондан
ФРАНЦЫЯ	—«Мары і К°»—Парыж
ФРГ—	—«Сікамэкс»—Парыж
	—«Вест Ост»—Гамбург
	—«Ліндэкс»—Мюнхен
ШВЕЦЫЯ	—«Німан і Шульц»—Стакгольм
АЎСТРАЛІЯ	—«Мурэй энд Хелс Фуд»—Сідней
	—«Ханза Трэйдынг»—Мельбурн
	—«Контал і К°»—Мельбурн
БЕЛЬГІЯ	—«Фюрнес Шыпінг энд Ажэнсі К° С. А.»—Брусель
ІТАЛІЯ	—«Грандзі Віяджы»—Рым, Мілан
АРГЕНЦІНА	—«Турызма Мундзіяль»—Буэнас-Айрэс
МЕКСІКА	—«Пакеціс Фамільярэс»—Мехіка
БРАЗІЛІЯ	—«Ліўрарыя Інтунліў»—Рыо-дэ-Жанейра
ШВЕЙЦАРЫЯ	—«Мела»—Базель
ДАНІЯ	—«Скандынавія—Аўстрыя»—Капенгаген
ЛІВАН	—«Бранзас Компані»—Бейрут



ВЯРТАЮЦЦА З ВЫРАЮ ГУСІ

Вяртаюцца з выраю гусі
На крыллях шырокіх, тугіх
Да роднай сваёй Беларусі,
Да тоняў, азёр дарагіх.

Што вас прымушае, скажыце,
Ад цёплага краю ляцець,
Маглі б вы і там, пэўна, жыці,
Выводзіць чародкі дзяцей?

— Ой, нельга, — адказваюць гусі, —
Бо сэрцы ж засталіся тут...
Таму зноў увосень у скрусе
Пакінем наседжаны кут.

І зноў прыляцім напрадвесні,
Каб ў чыстыя плёсы нырнуць.
Сваёю няхітраю песняй
Абудзім мы з неба вясну.

Сямён БЛАТУН.

УСТУПЛЕННЕ Ў СВЕТ ЦУДОЎНАГА

Шаснаццацігадовыя з гордасцю прад'яўляюць кантралёрам Палаца з'ездаў кніжачкі, на вокладках якіх серабром выціснута: «Юнацкі музычны сход».

Некалькі аркушаў у абанеменце ўжо адарвана. Але першы захоўваецца беражліва. На ім прызнанне Чарльза Дарвіна: «Калі б мне давялося зноў пражыць сваё жыццё, я ўстанавіў бы для сябе непарушнае правіла — рэгулярна чытаць вершы і слухаць музыку. Такім шляхам мне ўдалося б захаваць актыўнасць тых частак мозгу, якія цяпер атрафіраваліся. Страта гэта раўназначна страце шчасця».

Маладыя людзі, якія прыйшлі ў Палац з'ездаў, хочуць на ўсё жыццё захаваць сваё шчасце.

Чарговы сход вядзе кампазітар Д. Шастаковіч.

— Сёння мы пазнаёмім вас з творам Чайкоўскага «Лебядзінае возера», — гаворыць ён.

Юнакі і дзяўчаты, затаіўшы дыханне, слухаюць цікавы расказ лектара аб вядомым кампазітару і яго творы, які тут жа ілюструецца сцэнамі са спектакля. І так бывае на кожным музычным сходзе, што вядуць вядомыя кампазітары і прафесары.

Але не толькі гэтым шасці тысячам юнакоў і дзяўчат, якіх можа ўмясціць Палац з'ездаў у Крамлі, дадзена магчымасць навучыцца слухаць і разумець музыку, пранікнуць у свет цудоўнага. Вядомыя майстры музычнага мастацтва чытаюць гутаркі-лекцыі і для піянераў. Розніца толькі ў тым, што праграма тут менш складаная і канцэрты праводзяцца ў Калоннай зале Дома саюзаў.

І зусім нядаўна тут пачаў сваю работу універсітэт музычнай культуры для старшакласнікаў.

А колькі клубаў аматараў музыкі, музычных класаў з'явілася ў апошнія месяцы ў сярэдніх школах, цяжка нават падлічыць.

Высакародны абавязак выхоўваць музычную культуру ў мільёнаў дзяцей узяў на сябе Саюз кампазітараў СССР. У спецыяльную камісію па эстэтычным выхаванні моладзі ўвайшлі вядомыя выкладчыкі, музыказнаўцы, кампазітары, выканаўцы. А ўзначаліў яе кампазітар Дзмітрый Кабалеўскі.

У канцэртах для дзяцей прымае ўдзел Вялікі сімфанічны аркестр радыё і сімфанічны аркестр Маскоўскай філармоніі, у поўным складзе калектыў Вялікага тэатра, артысты Музычнага тэатра імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі, дзіцячы хор Інстытута мастацкага выхавання дзяцей пад кіраўніцтвам В. Сакалова.

Старшыні камісіі Дзмітрыю Кабалеўскаму споўнілася шэсцьдзесят год. Але гэты сталы і вельмі заняты чалавек з сапраўды юнацкай страснасцю прысвячае сябе эстэтычнаму выхаванню моладзі. Нядаўна па радыё трансліраваліся два цыклы яго лекцый для юных. Адзін з іх быў запісаны ў Крыме, дзе кампазітар адпачываў. Ён некалькі разоў сустракаўся з рэбятамі з піянерскага лагера «Артэк», цярпліва і натхнёна «ўводзіў» дзяцей у музыку.

Камісіі, падобныя маскоўскім, існуюць цяпер ва ўсіх рэспубліках СССР, пры ўсіх аддзяленнях Саюза кампазітараў. У краіне дзейнічаюць тысячы музычных гурткоў, універсітэтаў музычнай культуры, семінараў, музычных кабінетаў пры школах.

Т. ОСІПАВА.

АДН.

ВАС ШУКАЮЦЬ І ЧАКАЮЦЬ СВАЯКІ

КАЛЕСНІКА Генадзія Андрэевіча, які нарадзіўся ў 1925 годзе ў вёсцы Жукавічы Гродзенскай вобласці, шукае маці **КАЛЕСНІК Анастасія Іванаўна**. Усіх, хто ведае што-небудзь пра яго лёс, просім паведаміць у рэдакцыю «Голасу Радзімы».

МІНСКІ ПЛАНЕТАРЫЙ

Яго купал вышэй за купал цырка. У гэтым будынку змяшчаецца цэлы «сусвет». Гэта планетарый, які адкрыўся нядаўна ў Мінску ў Цэнтральным дзіцячым парку.

Аўтар праекта — архітэктар Наталля Афанасьева. Планетарый узведзен з белай цэглы, ацынкаванага металу і шкла. У астранамічнай вежы пад малым купалам устаноўлен тэлескоп, дзе рэбяты кругласутачна нясуць дзяжурства, назіраючы за зоркавым небам. Тут займаюцца будучыя фізікі, астраномы, касманаўты.

...Вось планетарый запоўніў шумны дзіцячы натоўп, але апраметная цемень прымусіла іх прыціхнуць. З'явіліся начныя зоркі, кратэры вулканаў Месяца. Фіялетавыя і блакітныя абрысы неба праступаюць усё больш ясна. З'яўляецца панарама Масквы. І вось ужо сонца залівае сваімі праменнямі зямлю. Яно знікае на імгненне за гарызонтам, каб узняцца ужо над плошчай Перамогі ў Мінску...

Панарама Мінска ўключае ўсе цікавыя архітэктурныя ансамблі сталіцы. Яе выканаў мастак Яўген Красоўскі разам з маладымі архітэктарамі Леанідам Левіным і Валянцінам Заньковічам.

Мінскі планетарый—добры падарунак беларускай моладзі.

М. СМІРНОЎ.

— І навошта я націснуў на той курок? Ці ж я ведаў, што ружжо страляе?—думаў Бульбінка, уцякаючы ад раз'юшанага вартаўніка.

— Як жа перайсці вуліцу?

— О, гэта, аказваецца, зусім проста. Дзякую табе, міліцыянер.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС: МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 77, ДОМ ДРУКУ. РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ». ТЭЛЕФОНЫ: 6-19-31, 6-97-93, 3-25-52.